Спаса. Тут яна памёрла і пахавана 23 траўня 1173 г. Цела яе адтуль было перанесена ў Кіеўскую Пячорскую лаўру пад апекай Праваслаўнай царквы. У 1910 г. цела сьвятой Афрасіньні было перавезена ў Полацк. Гэтак Афрасіньня, вялікая прасьвяціцелька Беларусі, вярнулася ў роднае беларускае месца. Дзе сяньня, пасьля бальшавіцкага панаваньня, гэтая беларуская сьвятасьць і які яе лёс? Хто ж гэта згадае!» [2, с. 56]. К счастью, по последним сведениям, мощи святой покровительницы земли белорусской всё же сохранились: «Несколько веков спустя, в 1910 году, святые мощи из Дальних пещер Киево-Печерской Лавры были перенесены в Полоцк. Торжество… длилось месяц, с 22 апреля по 22 мая Честные мощи игумении положили в основанный ею Спасо-Евфросиниевский монастырь, где они покоятся и ныне» [5, с. 13]. Духовные ипостаси Ефросиньи Полоцкой являют собой яркий исторический пример объединительных тенденций на основе универсальных критериев справедливости, выраженных в контексте православной христианской духовности, наглядный и поучительный для всего человечества в условиях технократического существования современности.

Литература

1. Карташев, А.В. Очерки по истории русской церкви / А.В. Карташев. - М., 1991. Т.1.
2. Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии / М.В. Довнар-Запольский.- Мн.: Баларусь, 2003.
3. Толстой, М.В. История Русской Церкви / М.В. Толстой.- М., 1991.
4. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі: Збор твораў / А.З. Станкевіч.- Вільня, 2008.
5. Велько, А.В. Православные святые земли белорусской / А.В. Велько.- Минск, 2015.

***Барысевіч Т.А., Менжынская А.Д., Струцінская Н.В.*** **Вобраз Еуфрасінні Полацкай у мастацтве**

З цемры мінулых стагоддзяў дайшлі да нас імёны выдатных дзеячаў беларускай культуры. Сярод іх асобае месца займае імя Ефрасінні Полацкай. З ёй асацыіруецца не толькі духоўнае жыццё

на ўсходнеславянскіх землях у ХП ст., але і ўся шматвяковая гісторыя Беларусі. Незвычайны лёс Е. Полацкай натхніў на творчасць многіх гісторыкаў, літаратараў, мастакоў.

Аб унучцы славутага князя Усяслава Чарадзея, князёўне, ігуменні, настаўніцы, выдатнай асветніцы, расказваецца ў «Жыці Еўфрасінні Полацкай». Гэты найкаштоўнейшы помнік старажытнай беларускай літаратуры, створаны ў канцы ХП ст. невядомым аўтарам, дайшоў да нас у шасцірэдакцыях, больш чым ста спісах.

Са старонак Жыція паўстае велічная постаць Е. Полацкай. Многія з прыведзеных у жыціі фактаў пра асобу святой леглі ў аснову лепшых мастацкіх твораў сучасных беларускіх аўтараў: гістарычнай аповесці В. Іпатавай «Прадслава», рамана "Спакуса" Т. Бондар, эсэ У. Арлова "Ефрасіння Полацкая", рамана-эсэ "Пакліканыя" В. Коўтун і многіх іншых. Бяспрэчна, што ў кожнага з вышэй названых твораў пра Е. Полацкую вобраз святой пададзены па-свойму: па законах канкрэтнага жанра, з улікам стылю, майстэрства кожнага з пісьменнікаў. Аднак відавочным застаецца і тое, што ўсе гэтыя творы ад самага старажытнага да апошняга па часе напісання яднае выключнае імкненне паказаць асобу незвычайнай духоўнай прыгажосці і абаяльнасці, асветніцу, падзвіжніцу, настойлівую і самаахвярную жанчыну.

Шмат паэтычных творау напісаны пра Е. Полацкую. В.Зуенак у творы "Апошняя малітва Еуфрасінні Полацкай"піша:

Я крывінка твая – крывічанка,  
Я былінка твая – палачанка,  
Як над пожняй тужлівая чайка,  
Я лячу да цябе, Радзіма,  
Са святога Ерусаліма.

В. Жуковіч у творы "Еўфрасіння Полацкая" зазначае:

Еўфрасіння, ты – святая;  
слава добрая твая  
у стагоддзях вырастае,  
зоркай свеціцца імя.

Л. Рублеўская у творы "Еўфрасіння (Балада аб жаночай волі)"

Што належыць болей –  
Сваё радзіць?  
Вучыць чужое?  
І што на што мяняць не варта –

Ні адгадаць, ні прадугледзець
Прадслава хоча стаць упарта
Святой – і вольнаю, як вецер.

Е. Полацкай пасвечаны творы Л. Геніюш “Еўфрасіння Полацкая”, Н. Гальпяровіч “Прадслава”, А. Бембеля “Абсяг Еўфрасінні” , “Святы покрыў над Беларуссю” , “Прэлюдыя пакаяння” , “Грахі гісторыі”.

Першы помнік беларускай святой быў усталяваны ў 1999 годзе ў Мінску у дворыку БДУ. Гэты помнік адліты з бронзы і ўсталяваны на гранітным п’едэстале. Святая прадстаўлена з наперсным крыжам, пяром і кнігай, хутчэй за ўсё, Бібліяй, у руках. Побач стаіць невялікі столік з паперай і чарніліцай. Аўтарам помніка з’яўляецца вядомы беларускі скульптар – манументаліст Ігар Голубеў.

Другі помнік Е. Полацкай быў усталяваны на яе радзіме ў Полацку ў 2000 годзе. Помнік вышыней у тры метры 20 сант. усталяваны ў цэнтры горада, ен стаіць на скрыжаванні вуліц, адна з якіх вядзе да Спаса-Еуфрасіннеўскага манастыра, дзе захоўваюцца мошчы святой. На гранітным пастаменце мы бачым святую ў манаскім адзенні, у правай руцэ яна трымае крыж, у левай, апушчанай, – ружанец. Гэты праект таксама выканаў мінскі скульптар, член Саюза мастакоў У. Голубеў.

Аўтарам трэцяга помніка Е. Полацкай з’яўляецца беларускі скульптар-манументаліст, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў А. Я. Арцімовіч, на гэтым помніку Ефрасіння трымае крыж, на плячах два галубы, напэўна, таму, што сама была голубам міру для палачан, бо, як сведчыць гісторыя, заклікала спыняць братазабойчыя войны і княжацкія сваркі.

Вобраз Ефрасінні Полацкай у іканапісе

Іканапіс – гэта асобы від мастацтва, якое патрабуе не толькі вызначных навыкаў, але і глыбокага разумення таго, над чым працуе іканапісец і што стварае. Тут важна ўлавіць усе дэталі: погляд, нахіл, кампазыцыю, якія сімвалічна могуць распавесці пра жыццё святога, бо менавіта дзякуючы абразу, мы маем жывое ўяўленне пра святую гістрыю. Е. Полацкая – беларуская святая, заступніца Беларусі перад Богам. З яе аблічам было створана шмат ікон, пачынаючы з дванаццатага стагоддзя.

Сёння такія іконы ствараюцца ў сваёй большасці паслушніцамі Спаса-Еуфрасіннеўскага манастыра. Калі мы шукалі матэрыял па тэме, мяне здзівіла, што праца ў іканапіснай манастыра пачынаецца пасля сняданку і працягваецца да вячэрняга набажэнства. Перад пачаткам працы сёстры чытаюць малітвы, іх каля шасці ,каб святые дапамаглі ім у гэтай цяжкай справе. Разглядаючы абразы, мы звярталі ўвагу перш за ўсё на погляд святой – ён заўсёды суре’зны, засяроджаны, накіраваны наперад, удалячынь, і мы ведаем, што яна сапраўды глядзела ў будучае. І таму сёння, праз дзевяць стагоддзяў, мы гаворым пра яе, просім у яе дапамогі, бачым і Спаса-Еуфрасінеускім манастыр, і адноўлены крыж. На ўсіх іконах святая трымае свой крыж – адзнаку хрысціянскай веры, але часам, мы бачым у яе руках кветку. Гэта кветка, як правіла, пагадвае лілею. З аднаго боку, яна можа быць сімвалам цнатлівасці святой, з другога, калі гэта, да прыкладу, папараць-кветка, яна можа быць сімвалам адыходу ад паганства.І ў заключэнні дададзім, што такім вобразам з выявай Е. Полацкай моляцца не толькі ў Беларусі.

Е. Полацкая пражыла вялікае жыццё, асветленае высакароднай ідэяй служэння народу. Яна стала адной з першых кананізаваных (прылічаных да святых) жанчын на ўсходніх землях, нябеснаю заступніцай не толькі Полацка, але і ўсёй беларускай зямлі.

***Анцыповіч М. В.*** **Дыхатамічнасць творчасці Еўфрасінні Полацкай**

У кантэксце гісторыі Беларусі XII стагоддзя полацкі перыяд, як ранняя праява беларускай дзяржаўнасці, спрычыніўся жыццём і дзейнасцю святой Еўфрасінні Полацкай, пабудовай Сафійскага сабора і іншых манументальных сакральных збудаванняў, першых спробаў полацкага летапісання. Усё гэтае занатавана ў ананімным творы “Жыціе Еўфрасінні Полацкай”, створанага неўзабаве пасля яе смерці.Асноўная крыніца біяграфічных звестак пра асветніцу – “Жыціе” – як адмысловы помнік старажытнабеларускай літаратуры, адзін з самых ранніх твораў гістарычнай прозы на Беларусі, які быў напісаны невядомым аўтарам у Полацку на мяжы XII-XIII стагоддзяу. “Жыціе” дайшло да нас у шасці рэдакцыях, прадстаўленае болей чым ста спісамі, самы старэйшы з якіх належыць да XVI ст. У “Жыціі” Еўфрасінні перапляталіся дзве